# ЗМЕСТ

I . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 8
II . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .17
III . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .34
IV . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .62
V . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .93
VI . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 139
VII . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 157
VIII . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 184
IX . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 205
X . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 216
XI . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 229
XII . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 242
Эпілог . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 249
Дадатак... . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 260
Прадмова да «Апавяданняў
Ямці пана Паўла Завішы» . . . . . . . . . . . . 271

Каментарыі і тлумачэнні . . . . . . . . . . . . 275

Гандзя була чарівниця
*Украінская песня*

Вядома ўсяму свету, дзе знаходзіцца Белая Русь. Зрэшты, аспаньству[1] казаць не трэба, што за дзівосы і цуды крыюцца ў гэтай рускай зямлі, якімі прыкметамі адарыў яе Стваральнік. Яе глеба не занадта плодная, затое лясоў і ўсялякіх водаў у ёй — незлічонае мноства, любы лес поўны звера і птушкі, любы вадаём — рыбы. Скоса, аднак, пазірае на яе і Кароны, і Літвы жыхар... А далібог, не маюць яны такіх вялікіх прычын, каб нас цурацца, бо ані радавітасцю, ані дастаткам, ані старой польскай цнотай белыя русіны нікольkі ім не саступаюць.

Да таго ж гэтая Русь — легендарная лясная пушча, да якой нага прафанаў не заходзіць, а напаўняюць яе паважным колам толькі птушкі і звяры, калі прыходзіць да іх старасць. І прытым, гэта не ў іншай якой дзяржаўнай зямлі, а менавіта ў гэтай Рускай і Белай знаходзіцца тое, што ўжо даўно брыдкі смурод сучаснай гнілізны выпарыў са свету: там сустракаюцца не апошнія дзецюкі, а на могілках блукае старадаўняя годнасць! А той самы славуты польскі анімуш[2], адносна якога хронікі не маюць досыць слоў дзеля пашаны і хвалы, які сёння

так часта падмяняецца падхалімствам усялякага выгляду, у гэтай правінцыі, на шляхецкіх дварах, а нярэдка нават і ў сялянскай хаце, жыве, дыхаючы на поўныя грудзі. Піжоны кажуць, быццам і да сённяшняга часу гэтая зямля суровая і некультурная. Але я на гэта не зважаю. Добра, няхай яна будзе грубаватай і шорсткай… Дык гэта ж не які-небудзь там нямецкі фанфарон, гэта шчыт вялікай рыцарскай дзяржавы — той дзяржавы, якую назвалі гонарам цывілізацыі і хрысціянства!.. Сапраўды, гэтая Русь і была самым лепшым шчытом… Аддаленая на ўсходні край, да Масквы, у несупынных войнах з яе царамі, пад капытамі іх коней яна не стапталася, не перацёрлася ў кашу, але, як вядома, вечна з дзідай супраць яе ўздымалася.

Што ж, не забароніш пестунам перарабляць цвёрды ад нараджэння мужчынскі волас на пух хедрэдонаў[3], размалёўваць па-жаноцку твар і распасціраць кожную яго маршчыну… Але падобная распуснасць у нас яшчэ дагэтуль не мела поспеху: мы ўсе — чубатыя куры і калючыя вожыкі, прычым ад першых дзён стварэння, ці, па меншай меры, ад таго часу, калі супольна з Літвою падалі Польшчы верную далонь у вуніі.

А пры тым мы ж не гэткія невымерныя дзікуны, як тыя чырвонаскурыя індзейцы, пра якіх чытаем, што жывуць яны ў палатках, званых «вігвамамі», а некаторыя з іх — нават на дрэвах, быццам вывёркі[4]. Усе яны шпацыруюць сабе ў адамавых шатах, для аздобы робячы на сваёй меднай скуры наколкі, прапітаныя раз-

настайнымі охрамі, і займаюцца аднымі толькі ловамі. Наадварот! Хіба толькі адзін пінчук з Палесся узводзіць сабе збудаванні на вадзе, як бабёр, а потым (так жартавалі з легкаверных французаў) ускараскваецца ў іх па вяровачнай драбіне, прычым паўсядзённа для зносін са сваякамі карыстаецца бабрынай гаворкай. Жывуць яшчэ ў зямных хацінках цыганы, якія нават да людзей не падобныя, і зрэдку нават у іх які-небудзь убогі ліцвін шукае для сябе абароны... Але ж такім самым спосабам жывуць і іх вандэйцы! Ды тут — не так: амаль паўсюдна — заможныя двары, палацы навейшых часоў і старыя замкі шляхецкага люду... А калі нават і селянін які — дык і той не ў хляве хаваецца!

Ёсць у нас таксама й гарады, дзе столькі карамеляў і марцыпану, як быццам яны там раслі спрадвеку!.. Гэта, што праўда, не Вільня, не Кракавы і Пазнані, не маладая Варшава ды не святы Кіеў рускіх князёў! Аднак яны чыстыя і вялікія: прастары[5] Полацк, Віцебск і Магілёў. Далёка ім, бадай, да заморскіх Парыжаў і распусных Венаў, куды нячыстая Семіраміда з Вавілона перанесла сваё котлішча; але ж, дзякуй Богу, ім яшчэ далей да тых Пецярбургаў і Масквы, да якіх... Не, мушу затрымаць на лейцах шляхецкі язык!..

Як годна Белую Русь рэпрэзентуе Дзвіна, якую географы *vocant*[6] Заходняй! Вядомая старажытным рымлянам і грэкам (у тыя часы гэты паўночны Дунай быў ахрышчаны Рубонам), яна паўстае добрым паслом перад Божай Літвою

ад нашых паветаў. Багатая знутры для любога карабля сваімі рыбамі, празрыстая і глыбокая, як пачуцці жыхароў, што жывуць па яе правым беразе[7]; калі трэба, то грозная і вельмі гнеўная, а ва ўсіх іншых выпадках паважная і *majestatis plena*[8], гэтая цудоўная рака красамоўна перdesigned казвае ёй свае турботы. «О жвавы Арол і дзёрзкая Пагоня! — кажа яна. — Я дагэтуль разбіваю сваю галаву аб Тэўтона, а тут, збоку, каб зняславіць ложа, успінаецца невядомы[9] кацап... Жвавы Арол, дзёрзкая Пагоня! Сюды, сюды палёт скіруйце, бо праб'е ліхая гадзіна». І вось — прабіла! Не Пагоня ўжо і не Белы Арол, а *monstruositas*[10], чорная «капейка» і «дзяньга» навіслі цяпер над Руссю. І ці ж ёсць якая-небудзь надзея, што нашыя справы пойдуць іншым ладам: зрэшты, мінуў «век сякерак», надышоў «век малых брушкаў»![11] Эх, надзеі ажыццяўляюцца рэдка!.. Толькі мы легкаверныя, прычым хранічна хворыя на гэтае *malum*[12].

# I

Тым часам па-над Дзвіною, у даўнейшым Полацкім ваяводстве, а ў сённяшніх Полацкім і Гарадзецкім «уездах» (так называюць павет кацапы) пражывалі нашчадкі трох радоў. Імёны і гербы той шляхты запісаны і ў Нясецкага, і ў Папроцкага[1], і ледзь не на кожнай старонцы гісторыі народа. Аднак жа я ў аповесці іх перараблю.

Дык вось, па-над Дзвіною і водамі іншай ракі (здагадайцеся якой!) у цудоўным старасвецкім замку жывуць Старастава сыны — тры браты, дагэтуль нежанатыя. Просты люд па прычынах, пра якія скажу ніжэй, заве іх Шатанамі. Далей, у бок ракі Обалі, у лістоўнічным двары, які крыху схіляецца да ўсходу сонца, быццам які габрэй набожны, пацук мудрых талмудаў, — там стары бацька глядзіць на згасанне свайго роду. Бо з ласкі Божай вісіць над калыскай яго дзіцяці не меч — вісіць кудзеля. Гэта — стары Мечнік і дачка яго Зоф'я. Далей, у беднай мясцовасці, услаўленай, аднак, цудоўным абразам Маці Божай, — пад Сіроцінам, у зробленым з густам амаль што палацы жыве малады нелюдзень, які рэдка бывае ў краіне, гэта сын Кашталяна пэўнай кашталяніі, што знаходзіцца далёка адсюль, у іншых землях дзяржавы. Яго бацька памёр, але заплямі ў сябе дамовамі з ворагам у дні Панскага гневу і нашага смутку. Сыну ён пакінуў маёмасць, аднак зганьбаваную, і хаця часта дзіравую кішэню латаў дасланымі з чужых двароў грашыма, аднак жа — к чорту *maleparta*[2]! — Кашталяну зусім не шанцавала. Праўда, сын яго не спазнае галечы, гэта ясна: ёсць шматлікія спосабы мець поспех, і выгаднай жаніцьбай ён можа зноў набіць вацак[3] сваёй маёмасці. Тым лягчэй гэта зрабіць, што на юнаку ніхто не заўважыць аніводнай заганы яго бацькі. Кажуць, што ён змагаўся нават пры Тадэвушу[4], а тварык яго маркотны, дый манеры сапраўды прыдворныя, такія бліскучыя, прывабныя для легкадумных

кабет. Рэзідэнцыю Кашталянава сына назавем Бяльмонтам, Мечнікаву — Шчаротай, а Старастававых сыноў — Арлаполь, бо мелі яны котлішча, назва якога гучала падобна да прозвішча, якое тут няхай будзе такім: Арлалёты. Мечніка назавем Падканвойным, а пана на Бяльмонце — Гажагорскім.

Сярод усіх гэтых радавітых уладальнікаў Арлалёты найбольш давалі падстаў гаварыць пра сябе. Іх род асеў тут толькі ў часы Стэфана[5], а ў Польшчы жыў з часоў Крывавуснага[6], аднак яшчэ раней карыстаўся ён славай і быў вельмі значны ў іншым народзе, які мае кроўнасць з ляхамі. Пры Пястах спарадзіў гэты род многіх саноўнікаў, як свецкіх, так і духоўных, і меў незвычайную магутнасць; аднак, калі пры апошнім Ягелону ўхапіўся ён за новую рэлігію ды яшчэ ўклаў у яе ўсю палкасць, калі перанёсся на гэтыя літоўскія ўскрайкі, у асяроддзе люду белых русінаў, адразу ж пры Вазах трапіў у няласку да тых, хто на той час стаяў ля стырна Айчыны. Адтуль пайшло, што, трэплючы, як і раней, маскавітаў, некалькі разоў выдаваў ён лютэраніну-шведу тых, хто мелі іншыя схільнасці, — і гэткія рэчы тым больш падкопвалі грунт пад тым старажытным родам! Аднак жа, трымаючыся здалёк ад большых пасад, — асабліва тады, калі заможныя палякі і літоўцы пераўтварыліся ў звычайных паслугачоў і інтрыганаў, — род Арлалётаў заўсёды вызначаўся ў сваім ваяводстве, карыстаўся вялікай павагай, выхоўваў у сабе найвялікшыя годнасці, а з-за ўласцівай свайму характару

свавольнасці часта бачыў, як яго сыны шукалі прытулку ў Запарожскай Січы і станавіліся там гетманамі. У гэтым я бачу прычыну таго, што з пракаветных часоў людзі называлі «атаманічамі» ўсіх, хто належаў да гэтага роду. Ён, у сваю чаргу, даўно падзяліўся на некалькі адгалінаванняў, і нават не ўсе іх прадстаўнікі мелі аднолькавае прозвішча.

З арлапольскай лініі пры каралю Цяляці[7] многімі землямі валодаў Стараста, муж незвычайнага розуму і вялікай дзяржаўнай мудрасці, так што можна было б назваць яго суровым Катонам ці справядлівым Арыстыдам[8]. Але ж, на няшчасце, быў ён дамаседам. Калі Цяля быў яшчэ толькі цялём, пан Стараста прымаў яго надзвычай гасцінна, з вялікай пашанай; і нават тады, калі ён ехаў першы раз да Петэрсбурка, Стараста прымаў яго як сына таго самага мудрага Панятоўскага, што быў аднойкрыві з родам князёў Чартарыйскіх. Аднак, калі тое Цяля і каралём-цялём сябе правіў, то ў Арлапольскім замку Стараста загадаў разбурыць цэлае крыло, па якім ён калісьці хадзіў, а на падворку казаў расстраляць яго партрэт, прыцягнуўшы да гэтай справы, для большай абразы, бяздомнага цыгана-валацугу. Кароль — ці не ведаў пра тое, ці толькі паказваў, што не ведае, — даслаў Старасту ў падарунак стужкі абодвух ордэнаў і камергерства. Але Стараста пачціва падзякаваў яму за тое і за другое ў стрыманых словах, ды абедзвюх рэчаў не прыняў, затое тым хутчэй злучыўся з князем Каралем Радзівілам і ў сваім ваяводстве горача

выступаў супраць такой абразы Польскаму Трону. Калі ж, аднак, незадаволеныя, паразлезліся паны па чужых сталіцах, а Валадар Нябесны да таго ж яшчэ многіх пакараў такой слепатою, што пачалі яны шукаць абароны для польскай Вольнасці ў дэспатычным і самаўпраўным Пецярбурку, Стараста ў роспачы рваў валасы на сваёй галаве і крычаў ім: *«Insensi!»*[9].

Вось тады і пасівеў ён, як голуб! Меркавалі нават, што праз збыткоўную тугу пачаў Стараста паддавацца меланхоліі ды часта пакутліва наракаў на ранейшае сваё дамаседства, а праз тое — на малое значэнне ў Рэчы Паспалітай. Нягледзячы на гэта, аднак, царыца звярнула на яго ўвагу, бо, калі толькі быў падпісаны першы падзел — які Стараста ўжо за дзесяць з лішнім гадоў перад усім тым *tanquam propheta*[10] быў прадказаў — вывезлі гэтага старца ў глыб Расіі, і загінуў ён там без следу. Хадзілі толькі глухія чуткі, што яго засеклі ланцугамі на Камчатцы ці ў Петрапаўлаўскай крэпасці — у той час, калі славуты адважны славак Бянёўскі наладзіў уцёкі адтуль, а пазней *ut Nobilis Polonus*[11] абвясціў сябе каралём далёкага Мадагаскару і паадпускаў нявольнікаў. Стараста ж, мусіць, самы старшы ўзростам, не здолеў уратавацца разам з уцекачамі. Частка яго ўладанняў пасля таго была сканфіскавана, прычым менавіта тая частка, якой ён не перапісаў на жонку. Яна ж, на шчасце, не чакаючы яго болей, перад самым няшчасцем па-свецку выехала разам з сыночкамі ў Рым, уладкаваўшы па дарозе старэйшага з іх у Гельветах[12] на навуцы.

З гэтай вось сям'і паходзілі Старасцічы. Ямць пан Януш Павел меў ужо добрых сорак пяць гадоў, а вярнуўся ў Польшчу толькі з Тадэвушам[13], аднак, заняты ў Варшаве нейкімі справамі, не быў разам з ім пад Мацяёвіцамі, хаця незадоўга перад тым, ля Рацлавіцаў, папалупіў сабе скуру. Ён быў самы старшы і быццам бы лічыўся галавою роду. Два малодшых, яснавяльможны Фларыян, трыццаці шасці год, і слаўны Казімір, малодшы за яго на тры гады, не дзяліліся з панам братам, але падпарадкоўваліся яму ва ўсім. Аднак жа іх фартуна была лепшай за бацькоўскую, паколькі тры сястры Ямці пана Старасты неўзабаве пасля яго паўміралі бяздзетнымі, а ўвесь свой набытак, як рухомы, так і нерухомы, з благаславеннем аддалі ў спадчыну мілым яго дзеткам, найперш ахвяраваўшы на *Панскія* кляштары, каб сэрцы набожных манахаў вечна палымнелі за гэтую нашу бедную Айчыну перад *Стваральнікам*.

Так жылі Старастaвы сыны, самыя заможныя на той час людзі ў гэтым краі. А мянушка іх «Шатаны» ўзнікла ад таго, што ўсе яны, як адзін, былі гарачыя і задзірыстыя, дзёрзкія ў душы авантурысты, а да таго ж «фармазоны», *quod* recte[14]: Франк-Масоны. Не было, што праўда, на тыя часы вялікай набожнасці сярод людзей, а нават шмат хто выхваляўся перад светам сваёй бязбожнасцю *vel*[15] атэізмам, быццам бы чымсьці добрым. Аднак жа ў беларускіх землях большымі, чым у якіх іншых краінах, былі пачцівасць і тая славутая шчырая старажытная набожнасць, яна ж —